Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 САКАВІКА 2017 г. СЕРАДА № 41 (28405)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Вуліца-прывід**

МС



**Затрымаць моладзь пасля размеркавання**

МС



**Як змагаюцца з адходамі**

МС

*ЛІЧБА ДНЯ*

**9 504,7 тыс. чалавек**

*склала колькасць насельніцтва Беларусі на 1 студзеня гэтага года. У апошнія гады колькасць насельніцтва рэспублікі расце. Так, на 1 студзеня 2015 года было 9 481 тысяча, на 1 студзеня 2016 года — 9 498 тыс. чалавек. Колькасць жыхароў Мінска дасягнула на 1 студзеня 2017 года 1 974,8 тыс. На другім месцы па колькасці насельніцтва — Мінская вобласць (1 423 тыс.). Сярод рэгіёнаў краіны менш за ўсё жыхароў налічваецца ў Гродзенскай вобласці — 1 047,5 тыс. чалавек. Па папярэдніх даных, у Беларусі на 1 студзеня гэтага года пражывалі 4 427 тыс. мужчын і 5 078 тыс. жанчын. У краіне працягваецца працэс урбанізацыі: удзельная вага гарадскога насельніцтва павялічылася за мінулы год з 77,6% да 77,9%.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8859 | ▲ |
| Еўра | 1,9973 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0693 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ВЯСНЕ — ДАРОГУ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінчанка Ганна БАРКУН з сынамі Андрэем і Мацвеем (у калясцы) засвойваюць азы язды на ролікавых каньках.

Ідэя+

*Новы, сумесны праект «Звязды» і камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама прысвечаны Году навукі. Яго мэта — прасачыць, як на справе ўкараняюцца ў вытворчасць перадавыя ідэі. У яго рамках мы сустрэнемся з вучонымі, таленавітымі кіраўнікамі, адоранымі рацыяналізатарамі, генератарамі ідэй, усімі тымі, дзякуючы каму наша жыццё становіцца больш камфортным і мабільным. Разам з намі вы даведаецеся, як цікавыя праекты нараджаюцца ў светлых галовах нашых суайчыннікаў і што робіцца для таго, каб яны пачалі працаваць на карысць чалавецтва. Магчыма, чыесьці прыклады натхняць і нашых чытачоў. Хто ведае, можа ўнутры вас таксама дрэмле геній, якога толькі трэба разбудзіць?*

## УЗНАГАРОДА ЗА КРЭАТЫЎНАСЦЬ

### Мясцовы інавацыйны фонд фінансуе новае і карыснае

**Нават самыя лепшыя інавацыйныя праекты могуць застацца на паперы, калі не знайсці на іх сродкі. Вядома, што самі па сабе грошы на галаву не зваляцца, трэба вучыцца іх шукаць. Спонсары, гранты, іншая дапамога — спосабаў шмат. Дзяржава не выключэнне. Яна таксама заахвочвае прадпрыемствы і бізнес, каб яны былі ініцыятыўнымі. Пры аблвыканкамах створаны інавацыйныя фонды, якія могуць прафінансаваць крэатыўную ідэю. Як дзейнічае гэты механізм, мы спыталі ў старшыні камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Руслана СТРАХАРА.**



— Само паняцце інавацыйны фонд існуе ў Беларусі даўно, але пераломным момантам стаў Указ №357 ад 7 жніўня 2012 года «Аб парадку фарміравання і выкарыстання сродкаў інавацыйных фондаў». Ён канкрэтна абазначыў, для якіх праектаў вылучаюцца сродкі, якім крытэрыям павінны адпавядаць праекты, размежаваў паняцці мясцовых інавацыйных фондаў і рэспубліканскіх, — кажа Руслан Страхар.

СТАР. 4

■ Ліст у нумар

## І БЕЗ ГРОШАЙ БЯДА, І З... ГРАШЫМА?

**Як пераадолець бар'еры ў нашай свядомасці і ў нашым жыцці**

Выпісваць газету «Звязда» пачаў яшчэ мой бацька Іван Хартонавіч Кароткі. А вось піша вам яго сын, інвалід I групы з дзяцінства. Што прымусіла? Як вы, напэўна, здагадаліся, крыўда.

Некалі за свае ўласныя грошы я купіў аўтамабіль «Ака» з ручным кіраваннем. Наколькі ён мне патрэбен, расказваць не буду, бо гэта зразумела і так. Скажу толькі, што гэтай машыне, як і ўсякай іншай, патрэбен догляд, а час ад часу — і нейкі рамонт. На чарговы я патраціў пэўную суму грошай, патрацілі смела, бо меў надзею, што на спраўнай машыне ў любы час змагу пад'ехаць у ашчадны банк і зняць там працэнты па ўкладзе.

Каб зрабіць гэта, сёлета, 30 студзеня, удваіх з сацыяльнай работніцай мы дабраліся да гарадскога пасёлка Капаткевічы, да ашчаднага банка. А вось далей...

Высветлілася, што выйсці з машыны я там проста не магу: лёд, хіба дзеля адчэпнага, ледзь-ледзь і месцамі пасыпаны пяском.

У выніку сацыяльны работнік пайшла ў касу з маімі дакументамі, але без мяне. Пайшла і амаль адразу вярнулася: сказала, што грошай ёй не даюць, што іх можа атрымаць толькі сам укладчык.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Пачалася падпіска на «Звязду» на II квартал 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!